3. Remini, R.V. A Short History Of The United States : From The Arrival Of Native American Tribes To The Obama Presidency / R.V. Remini. – New York : Harper Perennial, 2009. – 416 p.

4. Kansas-Nebraska Act; May 30, 1854 // Avalon Project – Documents in Law, History Diplomacy [Electronic resource]. – Mode of access: http://avalon.law.yale.edu/19th_century/kanneb.asp. – Date of access: 25.10.2015.

# Плантацыйная гаспадарка як фактар стрымлівання мадэрнізацыйных працэсаў у Злучаных Штатах Амерыкі

*Ермакоў Я. С., студ. III к. ГДУ ім. Ф. Скарыны,*
*навук. кір. Чаропка С. А., канд. гіс. навук, дац.*

Тэма эканамічнага развіцця Злучаных Штатаў перад Грамадзянскай вайной мае вялікую базу даследаванняў. Аднак тэматыка дадзенага артыкула практычна не распрацавана. Ускосна яе закранула ў сваіх працах расійская даследчыца І. М. Супаніцкая. У нашай краіне гэтай тэматыкай не цікавіліся.

Мадэрнізацыйныя працэсы ў ЗША паклалі падмурак для станаўлення і развіцця індустрыяльнай дзяржавы. Аднак гэтыя працэсы па ўсёй тэрыторыі краіны праходзілі нераўнаважна. Ніжэй мы гэта разгледзім на прыкладзе плантацыйнай гаспадаркі.

Мадэрнізацыя ў ЗША пачалася ў першай палове XIX ст. Яна праходзіла ў тры стадыі – транспартная рэвалюцыя, індустрыялізацыя і інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі. Развіццё гэтых стадый праходзіла па-рознаму на Паўночным Усходзе, Сярэднім Захадзе (Поўнач), і на Поўдні [1, с. 10].

Яшчэ з каланіяльных часоў на тэрыторыі Злучаных Штатаў існавала рабства і плантацыйная гаспадарка. З цягам часу з тэрыторыі паўночных штатаў яны сталі выцясняцца, і пачала развівацца фермерская гаспадарка. Гэта адбывалася дзякуючы асаблівасцям клімату Поўначы, бо ён у спалучэнні з геаграфічнымі ўмовамі не даваў плённа развіць плантацыйную гаспадарку. У рэшце рэшт, Поўнач да сярэдзіны XIX ст. пераадолела залежнасць ад прыроды, пачала аграрную рэвалюцыю і індустрыялізацыю [2, с. 17–18].

На Поўдні, дзе субтрапічны клімат спрыяў развіццю плантацыйнай гаспадаркі, спецыялізаваліся на падрыхтоўцы сельскагаспадарчых культур для знешнега рынку: цукру, рысу, бавоўны і г. д. Аднак сам рэгіён не быў аднародны, у ім выдзяляліся Верхні і Ніжні Поўдні. Іх кліматычныя ўмовы адрозніваліся паміж сабою гадавой тэмпературай паветра і працягласцю вегетацыйнага перыяду. Мадэрнізацыя ў Верхнім і Ніжнім Поўднях праходзіла

па-рознаму. Верхні Поўдзень ішоў павольна шляхам фермерскай гаспадаркі і ўключаўся ў агульнанацыянальную эканоміку; а Ніжні ўсё больш станавіўся замкнёным і больш плантацыйным па характары землекарыстання [1, с. 9–10]. Аднак адзначым, што да Грамадзянскай вайны Поўдзень заставаўся адзіным рэгіёнам, дзе жыццё было заснавана на рабаўладальніцкай ідэалогіі.

На Поўдні (Верхнім і Ніжнім), акрамя плантацыйных гаспадарак, існавалі і фермерскія. Яны былі найбольш распаўсюджаны на Верхнім Поўдні з прычыны акалічнасцей рэльефу гэтай мясцовасці. Тут фермераў звалі «беднымі белымі». Чыннікам такога становішча было тое, што эканамічнай асновай гэтага рэгіёна была плантацыйная гаспадарка, заснаваная на рабскай працы. Дробная фермерская гаспадарка на Поўдні не магла ў такіх умовах канкурыраваць з плантатарамі. Фермеры былі абмежаваны ў рэсурсах і напрамую залежалі ад сваіх «багатых братоў».

Аднак чаму так атрымалася, што «бедныя белыя» не выступалі супраць плантатараў, супраць рабства? Справа ў тым, што яны былі зацікаўлены ў захаванні інстытута рабства. Яны меркавалі, што вольныя афраамерыканцы змогуць канкурыраваць з імі на роўных, што будзе не на карысць ім.

Мадэрнізацыйныя працэсы, як мы бачым, істотна закранулі толькі эканоміку Поўначы. Эканамічнае развіццё Поўдня яны практычна не закранулі. Адсюль розныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця ў гэтых двух рэгіёнах. Поўнач імкнулася распаўсюдзіць эканамічную мадэрнізацыю на паўднёвыя штаты, выкарыстоўваць інтэнсіўны спосаб вытворчасці ў сельскай гаспадарцы, уводзіць пратэкцыяніссцкія тарыфы. Поўдзень жа выступаў супраць пратэкцыяніссцкіх тарыфаў, а таксама імкнуўся захаваць рабаўладальніцкую гаспадарку і выкарыстоўваць экстэнсіўны спосаб вытворчасці.

Усё вышэй адзначанае прывяло да таго, што плантацыйная гаспадарка стрымлівала развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў краіне. Справа дайшла да таго, што Поўдзень увозіў харч з-за мяжы, галоўным чынам – з Англіі. Такое становішча не было на руку прамыслоўцам Поўначы, так як пакупальніцкая здольнасць іх тавараў валілася з-за падзення попыту ўнутры краіны. Урэшце, у 1857 г. пачаўся ўнутрыдзяржаўны эканамічны крызіс, які моцна стукнуў па прамысловасці Поўначы [3, с. 291]. Такое становішча рэчаў толькі ўзмацняла канфрантацыю паміж Поўначчу і Поўднем, асабліва пасля пераможнай вайны з Мексікай (1846–1848 гг.).

Можна канстатаваць, што плантацыйная гаспадарка стрымлівала мадэрнізацыйныя працэсы не на ўсёй тэрыторыі ЗША, а толькі ў паўднёвых штатах. Гэта паўплывала на развіццё сацыяльна-эканамічных супярэчнасцей паміж Поўднем і Поўначчу. Аднак толькі пры спалучэнні гэтых супярэчнасцей з астатнімі (ідэалагічнымі, палітычнымі, сацыякультурнымі) стала магчымай з’яваю Грамадзянскай вайна ў ЗША.

**Літаратура**

1. Супоницкая, И. М. Мы всегда рвемся вперед : начало модернизации в США / И. М. Супоницкая // История. – 2004. – № 9. – С. 4–10.

2. Супоницкая, И. М. Север и Юг: два общества в одной Америке / И. М. Супоницкая // История. – 2003. – № 37. – С. 16–20.

3. Ефимов, А. В. Очерки истории США от открытия Америки до окончания гражданской войны / А. В. Ефимов. – 2-е изд. – М. : Просвещение, 1958. – 438 с.

# Правовые основы функционирования системы образования Республики Беларусь

*Зарецкий И. В., курсант IV к. ГрГУ им. Я. Купалы,*
*науч. рук. Кривчиков В. М., канд. ист. наук, доц.*

Законодательство об образовании – система нормативных правовых актов, регулирующих общественные отношения в сфере образования, включающая в себя Конституцию Республики Беларусь, Кодекс РБ об образовании и иные акты законодательства. Целями законодательства об образовании являются обеспечение реализации конституционного права граждан на образование и регулирование общественных отношений в сфере образования. Законодательство об образовании основывается на следующих принципах:

– соответствие Конституции Республики Беларусь;

– соответствие общепризнанным принципам международного права;

– обеспечение реализации права граждан на образование;

– обеспечение доступности образования;

– обеспечение качества образования;

– установление ответственности за несоблюдение законодательства об образовании.

Каждый гражданин Республики Беларусь имеет право на образование. Граждане Республики Беларусь имеют право на получение дошкольного, общего среднего, профессионально-технического, специального образования, дополнительного образования детей и молодежи (за исключением дополнительного образования детей и молодежи, получаемого в государственных детских школах искусств), дополнительного образования взрослых, а на конкурсной основе – бесплатного среднего специального, высшего образования, если соответствующее образование за счет средств республиканского и местных бюджетов они получают впервые [1, с. 27].

Второе и последующее профессионально-техническое, среднее специальное, высшее, послевузовское образование, дополнительное образование